# РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І АРГАНІЗАЦЫЯ ДАГАВОРА АБ КАЛЕКТЫЎНАЙ БЯСПЕЦЫ: ДАКТРЫНАЛЬНАЕ АБГРУНТАВАННЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ І ПАЗІЦЫЯ АДНОСНА РАЗВІЦЦЯ АРГАНІЗАЦЫІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**А. В. Дземідовіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, dzemidovich@bsu.by*

Артыкул прысвечаны аналізу ролі і месца Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) у дактрынальных дакументах Рэспублікі Беларусь, а таксама выяўленню пазіцыі дзяржавы адносна развіцця арганізацыі на сучасным этапе. Звяртаецца ўвага на роль і месца АДКБ у знешнепалітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь, вылучаюцца ініцыятывы дзяржавы ў арганізацыі, а таксама пазіцыя Рэспублікі Беларусь па забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі і актуальных напрамках развіцця Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. На аснове аналізу Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь, зацверджаных у 2024 г., указваецца, што ўдзел Беларусі ў АДКБ з’яўляецца адной з асноў знешняй палітыкі дзяржавы ў сферы падтрымання міру і бяспекі. У артыкуле падкрэсліваецца актыўная і адказная пазіцыя Рэспублікі Беларусь як удзельніка АДКБ, што праявілася ў мэтах і прыярытэтах Беларусі падчас яе апошняга старшынства ў арганізацыі, а таксама ініцыятывах, і прапановах, агучаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пазіцыя Рэспублікі Беларусь адносна развіцця арганізацыі ўключае ініцыятывы, накіраваныя на ўзмацненне ўнутранай еднасці дзяржаў-удзельніц, урэгуляванне і недапушчэнне крызісаў у рэгіёне адказнасці, павышэнне ролі арганізацыі і яе супрацоўніцтва з іншымі актарамі міжнародных адносін, умацаванне ваеннага складніку і інстытуцыйнага патэнцыялу АДКБ у інфармацыйна-аналітычнай сферы.

***Ключавыя словы:*** Рэспубліка Беларусь; Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы; бяспека; міжнародныя арганізацыі; шматбаковая дыпламатыя.

# РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ И ОРГАНИЗАЦИЯ ДОГОВОРА О КОЛЛЕКТИВНОЙ БЕЗОПАСНОСТИ: ДОКТРИНАЛЬНОЕ ОБОСНОВАНИЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ И ПОЗИЦИЯ ОТНОСИТЕЛЬНО РАЗВИТИЯ ОРГАНИЗАЦИИ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

**Е. В. Демидович**

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*dzemidovich@bsu.by*

Статья посвящена анализу роли и места Организации Договора о коллективной безопасности (ОДКБ) в доктринальных документах Республики Беларусь, а также выявлению позиции государства относительно развития организации на современном этапе. Обращается внимание на роль и место ОДКБ во внешнеполитической стратегии Республики Беларусь, выделяются инициативы государства в организации, а также позиция Республики Беларусь по обеспечению региональной безопасности и актуальных направлениях развития Организации Договора о коллективной безопасности. На основе анализа Концепции национальной безопасности и Военной доктрины Республики Беларусь, утвержденных в 2024 г., указывается, что участие Беларуси в ОДКБ является одной из основ внешней политики государства в области поддержания мира и безопасности. В статье подчеркивается активная и ответственная позиция Республики Беларусь как члена ОДКБ, что проявилось в целях и приоритетах Беларуси в период ее последнего председательства в организации, а также в инициативах и предложениях, озвученных Президентом Республики Беларусь. Позиция Республики Беларусь относительно развития организации включает инициативы, направленные на укрепление внутреннего единства государств-членов, разрешение и предотвращение кризисов в регионе ответственности, повышение роли организации и ее взаимодействия с другими субъектами международных отношений, укрепление военной составляющей и институционального потенциала ОДКБ в информационно-аналитической сфере.

***Ключевые слова:*** Республика Беларусь; Организация Договора о коллективной безопасности; безопасность; международные организации; многосторонняя дипломатия.

# THE REPUBLIC OF BELARUS AND THE COLLECTIVE SECURITY TREATY ORGANIZATION: DOCTRINAL JUSTIFICATION OF INTERACTION AND POSITION REGARDING THE DEVELOPMENT OF THE ORGANIZATION AT THE PRESENT STAGE

**A. V. Dzemidovich**

*Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, dzemidovich@bsu.by*

The article is devoted to the analysis of the role and place of the Collective Security Treaty Organization (CSTO) in the doctrinal documents of the Republic of Belarus, as well as identifying the position of the state regarding the development of the organization at the present stage. Attention is drawn to the role and place of the CSTO in the foreign policy strategy of the Republic of Belarus, the state's initiatives in the organization are highlighted, as well as the position of the Republic of Belarus on ensuring regional security and current directions of development of the Collective Security Treaty Organization. Based on the analysis of the National Security Concept and the Military Doctrine of the Republic of Belarus, approved in 2024, it is indicated that Belarus' participation in the CSTO is one of the foundations of the state's foreign policy in the field of maintaining peace and security. The article emphasizes the active and responsible position of the Republic of Belarus as a member of the CSTO, which was manifested in the goals and priorities of Belarus during its last chairmanship of the organization, as well as in the initiatives and proposals voiced by the President of the Republic of Belarus. The position of the Republic of Belarus regarding the development of the organization includes initiatives aimed at strengthening the internal unity of member states, resolving and preventing crises in the region of responsibility, increasing the role of the organization and its interaction with other subjects of international relations, strengthening the military component and institutional potential of the CSTO in the information and analytical sphere.

***Keywords:*** Republic of Belarus; Collective Security Treaty Organization; security; international organizations; multilateral diplomacy.

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) з 2002 г. (да Дагавора аб калектыўнай бяспецы далучылася ў снежні 1993 г.). АДКБ займае важнае месца ў знешнепалітычнай стратэгіі дзяржавы, што ўзмацняецца ў апошні час з улікам змен у сістэме глабальнай бяспекі, а таксама новых выклікаў у зоне адказнасці арганізацыі.

Мэта дадзенага артыкула – ацэнка ролі і месца Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў дактрынальных дакументах Рэспублікі Беларусь, а таксама выяўленне пазіцыі дзяржавы адносна развіцця арганізацыі на сучасным этапе. Аўтар за ўмоўную кропку адліку перыяду для аналізу ўзяў 2023 г. – год папярэдняга старшынства Рэспублікі Беларусь у арганізацыі, што з'яўляецца ніжняй храналагічнай рамкай даследавання.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца ўдзел Рэспублікі Беларусь у Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы; прадметам – абгрунтаванне ўзаемадзеяння Рэспублікі Беларусь у АДКБ у дактрынальных дакументах, а таксама выяўленне пазіцыі адносна развіцця арганізацыі на сучасным этапе.

Аналізуючы ўзаемадзеянне Рэспублікі Беларусь з АДКБ, неабходна звярнуць увагу, якое месца адводзіцца дадзенай структуры ў дакументах, якія адлюстроўваюць афіцыйныя погляды дзяржавы на сферу бяспекі.

**Роля АДКБ** вызначана і выкладзена у **дактрынальных дакументах – Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь.** У апошняй рэдакцыі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, зацверджанай Усебеларускім народным сходам у красавіку 2024 г., увогуле ўсебаковае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з дружалюбнымі краінамі ў межах інтэграцыйных аб'яднанняў трактуецца як адна з асноў знешнепалітычнай дзейнасці (разам са стратэгічнымі сазюзніцкімі адносінамі з Расійскай Федэрацыяй, умацаваннем стратэгічнага партнёрства з Кітай-

скай Народнай Рэспублікай, узаемадзеянні з іншымі дзяржавамі, якія паважаюць нашы погляды і інтарэсы) [1, с. 8]. З улікам рызыкі парушэння стратэгічнай стабільнасці ў рэгіёне Усходняй Еўропы, адзначаецца сярод іншага, што саюзніцкія адносіны з Расійскай Федэрацыяй і дзяржавамі – членамі АДКБ «забяспечваюць ваенную бяспеку краіны на ўзроўні абароннай дастатковасці» [1, с. 10]. «Удзел у сістэмах міжнароднай і рэгіянальнай калектыўнай бяспекі» адпаведна Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі з'яўляецца адным з прынцыпаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі [1, с. 19]. Сярод напрамкаў, на якіх сканцэнтраваны меры па абароне ад знешніх пагроз нацыянальнай бяспекі, і якія маюць дачыненне да пазначанай тэмы, са зместу дакумента можна вылучыць актыўны ўдзел у дзейнасці АДКБ, што трактуецца як неад'емны складнік падтрымкі міжнароднай і еўразійскай бяспекі, а таксама «ўдзел у выкананні пасрэдніцкіх функцый пры ўрэгуляванні канфліктаў і ажыццяўленні міратворчай дзейнасці пад эгідай ААН і АДКБ» [1, с. 21]. Адпаведная роля адводзіцца арганізацыі ў плане абароны ад знешніх крыніц ваенных пагроз: праз павышэнне эфектыўнасці сіл і сродкаў калектыўнай бяспекі АДКБ [1, с. 27].

Ваенная дактрына Рэспублікі Беларусь, зацверджаная ў красавіку 2024 г., сярод мэт ваеннай палітыкі дзяржавы вызначае «развіццё і ўмацаванне сістэм калектыўнай бяспекі ў межах Саюзнай дзяржавы, АДКБ і Садружнасці незалежных дзяржаў» [2, с. 15], а таксама «прадвіжэнне ініцыятыў па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі» пад эгідай такіх міжнародных арганізацый як ААН, АБСЕ, АДКБ [2, с. 15]. Адзначана, што для рэалізацыі мэт ваеннай палітыкі Рэспубліка Беларусь у межах АДКБ будзе працягваць «умацоўваць рэгіянальную сістэму калектыўнай бяспекі, прымаць неабходныя меры па павышэнні згуртаванасці дзяржаў-членаў, удасканаленні сістэмы крызіснага рэагавання, а таксама пашырэнні ўдзелу ў дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі» [2, с. 15].

Спецыфіка і прырода Ваеннай дактрыны як важнейшага дакумента ў галіне абароны абумовіла той факт, што месца і роля АДКБ паслядоўна выкладзены ў алгарытме мер, якія могуць рэалізавацца дзяржавай у залежнасці ад узроўню ваенных небяспек, якія ранжыраваны наступным чынам: рызыка, выклік, пагроза. Глава 7 пад назвай «Забеспячэнне ваеннай бяспекі» ўтрымлівае параграф 1 «Недапушчэнне эскалацыі ваенных небяспек і прадухіленне ваенных канфліктаў», дзе ўзгодненасць палітыка-дыпламатычных і іншых неваенных мер у межах Саюзнай дзяржавы і АДКБ разглядаецца як адзін са спосабаў рэагавання пры наяўнасці ваеннай небяспекі на ўзроўні рызыкі [2, с. 17]. Пры наяўнасці ваеннай пагрозы на ўзроўні выкліку праводзяцца меры, характэрныя для ўзроўню рызыкі, а таксама дадатковыя, сярод якіх – «задзейнічанне патэнцыялу дзяржаў – саюзнікаў Рэспублікі Беларусь для недапушчэння далейшай эскалацыі ваенных небяспек і прадухілення ўзнікнення ваенных канфліктаў» [2, с. 18]. Пры наяўнасці ваеннай пагрозы Рэспубліцы Беларусь – задзейнічанне патэнцыялу АДКБ (сіл і сродкаў), а таксама «дэманстрацыя рашучасці прымяніць ваенную сілу, у тым ліку сумесна з дзяржавамі – саюзнікамі» разглядаюцца ў Ваеннай дактрыне як элементы комплексу дадатковых мер апроч тых, якія праводзяцца на ўзроўнях рызыкі і выкліку [2, с.18]. Прадугледжана выкарыстанне дапамогі дзяржаў – саюзнікаў і дружалюбных краін у выпадку ўзнікнення непасрэднай пагрозы агрэсіі (параграф 2 «Асновы падрыхтоўкі абароны») [2, с. 19]. Выкарыстанне магчымасцей дзяржаў-саюзнікаў рэгламентуе і параграф 2 «Неваенныя меры па вырашэнні ваенных канфліктаў» Главы 8 пад назвай «Вырашэнне ваенных канфліктаў».

Асобная глава Ваеннай дактрыны – Глава 9 «Прымяненне ваеннай сілы ў рамках выканнання саюзніцкіх абавязацельстваў і ўдзелу ў дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі» – датычыцца выкарыстання ваеннай сілы ў межах саюзніцкіх абавязацельстваў.

Яна, апрача іншага, прадугледжвае адпаведныя меры з боку Рэспублікі Беларусь у адказ у выпадку выкарыстання ваеннай сілы, накіраванай супраць аднаго з суб'ектаў Саюзнай дзяржавы, а таксама ў выпадку агрэсіі супраць аднаго з членаў АДКБ, што будзе трактавацца як агрэсія супраць усіх дзяржаў-удзельніц арганізацыі [2, с. 25]. Такім чынам захаваны асноватворны прынцып калектыўнай бяспекі – прынцып непадзельнасці бяспекі, што трактуецца як адзін з асноўных у дзейнасці АДКБ. Агавораны ўдзел Рэспублікі Беларусь у міратворчай дзейнасці, у тым ліку пад эгідай ААН і АДКБ [2, с. 25]. Сярод асноўных напрамкаў ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва вылучаецца «развіццё сістэм абмену ваенна-тэхнічнай інфармацыяй» у межах АДКБ [2, с. 32].

**Старшынство дзяржавы ў АДКБ** яскрава **адлюстроўвае яе канцэптуальнае бачанне місіі аранізацыі** з улікам актуальных выклікаў часу. Як ужо было адзначана вышэй, папярэдні раз Рэспубліка Беларусь старшынствавала ў АДКБ у 2023 г. Старшынство Беларусі прайшло пад дэвізам «Праз салідарнасць і супрацоўніцтва – да міру і бяспекі», што адюстравала сутнасць беларускай пазіцыі адносна развіцця як самой арганізацыі, так і міжнарародных адносін у рэгіянальным і глабальным вымярэнні. Мэтамі старшынства Рэспублікі Беларусь у АДКБ на той час з'яўляліся: на ўнутраным контуры – узмацненне згуртаванасці дзяржаў – членаў АДКБ, паніжэнне ўзроўню напружанасці і ўрэгуляванне супярэчнасцей паміж імі; на знешнім – умацаванне ролі АДКБ у сістэме міжнародных адносін [3]. Прыярытэтамі з'яўлялася наступнае: урэгуляванне крызісных сітуацый і недапушчэнне далейшай дэстабілізацыі ў зоне адказнасці АДКБ; эфектыўнае пазіцыянаванне АДКБ у сістэме міжнародных адносін шляхам развіцця супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі і трэцімі краінамі, а таксама адаптацыяй арганізацыі да зменлівых выклікаў і пагроз; умацаванне ваеннага складніку арганізацыі, а менавіта павышэнне га-

тоўнасці кампанентаў войскаў АДКБ да выканання задач па прызначэнні, а таксама ўмацаванне ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва; нарошчванне інстытуцыйнага патэнцыялу АДКБ у інфармацыйна-аналітычнай сферы [3].

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка на сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, якая адбылася 23 лістапада 2023 г., аналізуючы дзейнасць арганізацыі падчас старшынства Беларусі, адзначыў, што мэты, абазначаныя беларускім бокам, у цэлым дасягнуты [4]. Таксама кіраўнік дзяржавы агучыў пазіцыі і прапановы Рэспублікі Беларусь адносна развіцця арганізацыі, падкрэсліўшы важнасць захвання балансу нацыянальных і калектыўных інтарэсаў дзяржавамі – членамі АДКБ. Так, А. Р. Лукашэнка падзяліўся меркаваннем адносна развіцця міжнародных адносін, падкрэсліўшы асноўныя тэндэнцыі іх развіцця, сярод якіх: паэтапны пераход да шматпалярнасці, крызіс міжнароднага права, гонка ўзбраенняў, разгаранне ачагоў рэгіянальных канфліктаў, мілітарызацыя суседніх дзяржаў – членаў НАТА і інш. Прэзідэнтам падкрэслена неабходнасць адэкватнага рэагавання на выклікі часу і ўзгодненасць дзеянняў у гэтым плане, адзначана здольнасць АДКБ спраўляцца з цяжкасцямі ў зоне сваёй адказнасці, звернута ўвага на важнасць прагрэсу ва ўрэгуляванні канфлікту на Паўднёвым Каўказе і вырашэнні супярэчнасцей паміж Кыргызстанам і Таджыкістанам. Кіраўнік Рэспублікі Беларусь адзначыў, што прыярытэтныя напрамкі старшынства, прапанаваныя ў свой час нашай краінай, сфармуляваны з ідэяй на даўгатэрміновую перспектыву развіцця АДКБ [4]. Пры гэтым агучана думка, што неабходна быць больш моцнымі і згрутаванымі, выказана пажаданне Казахстану (на той час – краіна, да якой пераходзіла старшынства ў АДКБ) садзейнічаць пераемнасці ў рэалізацыі прыярытэтных кірункаў.

**Ацэнка дзейнасці АДКБ і прапановы** адносна далейшага развіцця арганізацыі былі **артыкуляваны главой Рэспублікі Беларусь** на сесіі Савета калек-

тыўнай бяспекі АДКБ (вышэйшага органа арганізацыі), якая адбылася 28 лістапада 2024 г. у Астане. Удзельнікі пасяджэння выказалі меркаванні аб ваенна-палітычнай сітуацыі ў рэгіёне, абмеркавалі вынікі і перспектывы далейшага супрацоўніцтва; дадзена ацэнка старшынства Рэспублікі Казахстан у арганізацыі, заслуханы прыярытэты Кыргызскай Рэспублікі, да якой перайшло старшынство ў арганізацыі з 1 студзеня 2025 г. [5]. У сваім выступленні Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка вызначыў роль АДКБ, адзначыўшы, што ў новай парадыгме міжнародных адносін арганізацыя павінна стаць адной з ваенна-палітычных апор архітэктуры еўразійскай бяспекі. Беларускім лідарам былі прадстаўлены новыя задачы, якія павінна рашаць АДКБ дзеля ўмацавання еўрапейскай бяспекі, унутранай еднасці, пазітыўнага іміджу арганізацыі [6]. Сярод іх:

1) неабходнасць павышэння ўзаемадзеяння міжнародных рэгіянальных арганізацый, прадстаўленых у еўразійскай прасторы – АСЕАН, АДКБ, ШАС, СНД, Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі, Савета супрацоўніцтва арабскіх дзяржаў Персідскага заліва. У якасці механізму рэалізацыі дадзенай задачы прапанавана пашырыць фармат рэгулярных сустрэч кіраўніцтва АДКБ, ШАС і СНД, далучыўшы да яго вышэйшых службовых асоб іншых рэгіянальных арганізацый. Адзначалася, што Беларусь гатова стаць местам правядзення падобнага форуму. Падкрэслівалася важнасць абмеркавання пытанняў больш цеснага ўзаемадзяння АДКБ і ШАС і неабходнасць выкарыстання патэнцыялу апошняй у сферы падтрымання бяспекі;

2) неабходнасць актывізацыі супрацоўніцтва ў галіне інфрамацыйнай бяспекі і праблем, звязаным з некантралюемым выкарыстаннем магчымасцей штучнага інтэлекту. А. Р. Лукашэнка адзначыў, што АДКБ да практычнага вырашэння дадзеных пытанняў пакуль што не прыступіла. Узгадана Пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў – членаў

Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў вобласці забеспячэння інфармацыйнай бяспекі, падпісанае ў Мінску 30 лістапада 2017 г., ад якога, патрэбна «павысіць практычную аддачу». Нагадаем, што дадзенае пагадненне ўступіла ў сілу для Рэспублікі Беларусь 1 красавіка 2019 г. [7]. Яго мэтай з'ўяляецца развіццё ўзаемадзеяння ў інтарэсах забеспячэння інфармацыйнай бяспекі дзяржаў – членаў АДКБ, для дасягення якой, удзельнікі, згодна з пагадненнем, сярод іншага, абавязваліся садзейнічаць «распрацоўцы і больш хуткаму прыняццю пад эгідай ААН універсальных правіл, норм і прынцыпаў адказных паводзін дзяржаў у інфармацыйнай прасторы» [8];

3) стварыць агульны дагаворна-прававы механізм, які б дазволіў у будучым забяспечыць рэжым кантролю над узбраеннем новага тыпу [6].

Шэраг агучаных задач і ініцыятыў знайшоў адлюстраванне ў Дэкларацыі Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы [9].

Генеральны Сакратар АДКБ І. Н. Тасмагамбетаў ў інтэрв'ю, дадзенаму інфармацыйнаму агенцтву БелТА, ацэньваючы ўклад Рэспублікі Беларусь у АДКБ, адзначыў: «Важна падкрэсліць, што Беларусь заўсёды дэманстравала выключна адказны і ініцыятыўны падыход да ўдзелу ў АДКБ. Многія палітычныя і абаронныя праекты, рэалізаваныя ў фармаце арганізацыі, атрымалі імпульс менавіта дзякуючы актыўнай пазіцыі Мінска» [10].

У якасці заключэння можна сказаць, што АДКБ займае важнае месца ў знешнепалітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь. Асэнсаванне ролі арганізацыі адлюстравана ў абноўленых дактрынальных дакументах – Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь – з улікам новай геапалітычнай сітуацыі і тэндэнцый развіцця міжнародных адносін. Рэспубліка Беларусь – адказны і надзейны партнёр па арганізацыі, а яе пазіцыя адносна развіцця АДКБ на сучасным этапе характарызуецца ўзважаным, актыўным, гібкім па-

дыходам, што дэманструе здольнасць хутка рэагаваць на выклікі сучаснасці, а часам іх прадугадваць.

## Бібліяграфічны спіс

1. Об утверждении Концепции национальной безопасности Республики Беларусь : Решение Всебелорус. народ. собрания от 25 апр. 2024 г. № 5 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P924v0005 (дата обращения: 10.06.2025).

2. Об утверждении Военной доктрины Республики Беларусь : Решение Всебелорусского народного собрания от 25 апр. 2024 г. № 6 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P924v0006 (дата обращения: 10.06.2025).

3. Участие в саммите ОДКБ в Ереване // Президент Республики Беларусь. – 23.11.2022. – URL: https://president.gov.by/ru/events/aleksandr-lukashenko-23-noyabrya-primet-uchastie-v-sammite-odkb-v-erevane (дата обращения: 10.06.2025).

4. Сессия Совета коллективной безопасности ОДКБ // Президент Республики Беларусь. – 23.11.2023. – URL: https://president.gov.by/ru/events/sammit-organizacii-dogovora-o-kollektivnoy-bezopasnosti (дата обращения: 10.06.2025).

5. В Астане состоялась сессия СКБ ОДКБ // Организация Договора о коллективной безопасности. – 24.11.2024. – URL: https://odkb-csto.org/news/news_odkb/v-astane-sostoyalas-sessiya-skb-odkb/#loaded (дата обращения: 10.06.2025).

6. Саммит Организации Договора о коллективной безопасности // Президент Республики Беларусь. – 28.11.2024. – URL: https://president.gov.by/ru/events/sammit-organizacii-dogovora-o-kollektivnoj-bezopasnosti (дата обращения: 10.06.2025).

7. В государствах – членах ОДКБ вступило в силу Соглашение о сотрудничестве в области обеспечения информационной безопасности // Организация Договора о коллективной безопасности: [сайт]. – URL: https://odkb-csto.org/news/news_odkb/v-gosudarstvakh-chlenakh-odkb-vstupilo-v-silu-soglashenie-o-sotrudnichestve-gosudarstv-chlenov-odkb-/#loaded (дата обращения: 10.06.2025).

8. Соглашение о сотрудничестве государств – членов Организации Договора о коллективной безопасности в области обеспече-

ния информационной безопасности : [подписано в Минске 30 нояб. 2017 г.] // Электронный фонд правовых и нормативно-технических документов. – URL: https://docs.cntd.ru/document/542645728 (дата обращения: 10.06.2025).

9. Декларация Совета коллективной безопасности Организации Договора о коллективной безопасности от 28 нояб. 2024 г. // Организация Договора о коллективной безопасности. – 03.12.2024. – URL: https://odkb-csto.org/news/news_odkb/deklaratsiya-soveta-kollektivnoy-bezopasnosti-organizatsii-dogovora-o-kollektivnoy-bezopasnosti-/#loaded (дата обращения: 10.06.2025).

10. Интервью Генерального секретаря ОДКБ Имангали Тасмагамбетова информагентству БелТА // Организация Договора о коллективной безопасности. – 01.07.2024. – URL: https://odkb-csto.org/news/news_odkb/intervyu-generalnogo-sekretarya-odkb-imangali-tasmagambetova-informagentstvu-belta/#loaded (дата обращения: 10.06.2025).